п'есе А. Дударава, на сцэне змясцілася толькі палова калодзежнага зруба. Але той спектакль не забуду ніколі. Людзі, расчуленыя, са слязьмі на вачах дзякавалі нам за тое, што... нарэшце адчулі сябе здольнымі пазбыцца зневажальнага звання «неперспектыўныя», што, далучыўшыся праз мастацтва да сваёй матчынай мовы, убачылі сябе часцінкай вялікага народа. Маўляў, з такою моваю варта людзьмі звацца.

Тут, у гэтых вёсачках, што стуліліся ў глыбінцы, на самай ускраіне Беларусі, мы яшчэ раз пераканаліся, як важна, каб са сцэны на поўны голас гучала наша роднае беларускае слова. Жывы, шчодры дыялог з народам можна весці толькі на ягонай мове. Мы ніколі не павінны забывацца пра тое, што ў роднай мове абагульнены і захаваны ўсе шматаблічныя выявы духоўнага багацця народа, што яна мае магутную сілу, здольная узрушыць душу, раскрыць чалавечы талент, адамкнуць генны код спадчыннага багацця нацыі і тым самым узбагаціць кожнага з нас, заклікаць да творчай дзейнасці.

Пацвярджаюць сказанае і беларускія паэты, якія ў сваіх аўтабіяграфіях часта пішуць пра тое, што штуршком да творчасці, паэтычным азарэннем было для іх жывое беларускае слова. Пра гэта пісаў і Янка Купала ў вершы «Роднае слова».

А давайце прыкінем, дзе цяпер нашы юнакі і дзяўчаты пачуюць палымянае і пяшчотнае, трапяткое роднае слова? У кінатэатрах? Дык і «Беларусьфільм» часцей прапануе неахайную моўную мешаніну, вінегрэт. У абласных драматычных тэатрах? А колькі іх у нас працуе па-беларуску? Услед за прафесіяналамі і многія аматарскія калектывы ставяць беларускія п'есы ў перакладзе, і як эталон, узор іх часам нават пасылаюць за мяжу.

Думаю, прыйшла пара аматарскаму тэатру ўзяць на сябе ганаровую місію адраджэння роднага слова на сцэне.

Тут вялікую дапамогу могуць аказаць рэдакцыі, выдавецтвы, калі найхутчэй выдадуць усе п'есы беларускіх драматургаў, складуць поўную анталогію аднаактовай беларускай п'есы. Вельмі, надзвычай мала выдаецца на беларускай мове руская савецкая і замежная драматургія. А здаецца ж, ужо час прывыкнуць, што на беларускай мове можа раўнацэнна арыгіналу гучаць кожны класік свету.

І яшчэ. Я лічу, што вельмі шкодзяць развіццю аматарскага тэатра ўсялякія конкурсныя рагаткі — экзамены з іх закуліснай валтузнёй. І — што казаць! — многія калектывы нават прызвычаіліся працаваць похапкам, ад агляду да агляду.

У самадзейнасці наогул не павінна быць ніякіх экзаменаў. Жадае калектыў удзельнічаць у конкурсе — калі ласка, запрашайце; не — і не трэба. Суровае творчае жыццё само праэкзаменуе, адфільтруе і вызначыць кожнаму адпаведнае месца ў мастацтве, лепш за ўсялякія аўтарытэтныя камісіі.

Добрую справу робіць Беларускае тэлебачанне. Мы вельмі ўдзячныя за тое, што яно тактоўна, без прыхарошвання, без паспешлівай касметыкі выводзіць у эфір і нашы работы. Як кажуць, чым багаты, тым і рады. Мне здаецца, што нешта падобнае павінен рабіць і Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр культуры. Рэгулярна, па загадзя разумна распрацаванаму графіку выклікаць у Мінск аматарскія калектывы. Разам са сталічнай тэатральнай грамадскасцю праглядаць, адкрыта абмяркоўваць іх спектаклі. І рабіць гэта ціха, спакойна, без фестывальнай мітусні.

Некалькі слоў наконт рэарганізацыі самадзейных тэатраў у паўпрафесійныя трупы. Калі каму не да спадобы вольныя ўзоры народнага аматарскага строю, то няхай нацягвае на сябе цесненькі зашмальцаваны сурдуцік прафесіянала. Пажадаем яму поспеху. А наш тэатр, ад пачатку натрапіўшы на жыватворную крыніцу народнай творчасці, хочацца верыць, ніколі ад яе не адступіць. Людзі аматарскага мастацтва — гэта падзвіжнікі на культурнай, асветніцкай ніве. Яны нясуць народу жывое, асветленае натхненнем слова, здольнае ў кожным чалавеку абудзіць творцу.

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

**Аляксандр Карацееў**

# Капыльскія музыкі

Калі ў 1652 годзе Капыль атрымаў магдэбургскае права, на яго гербе з'явіўся сігнальны паляўнічы рог з муштуком. Вядома, гэта магло быць простай выпадковасцю. Але з гісторыі факта не выкінеш. На гербе Капыля быў духавы музычны інструмент.

Колькі безыменных таленавітых музыкаў было на працягу стагоддзяў на Капыльшчыне? Сёння больш-менш дакладныя звесткі мы маем толькі пра апошнія дзесяцігоддзі. З 1925 года пачаў сваю дзейнасць духавы аркестр Капыльскай гарадской добраахвотнай пажарнай дружыны. Ён налічваў 22 выканаўцы і меў рэдкі на паўнаце музычны інструментарый: трамбон, 3 кларнеты, 5 труб, 2 геліконы і г. д. У 1930-ыя гады ў Капылі з'яўляюцца харавыя гурткі, струнны аркестр народных інструментаў.

У 1936-ым на Капыльшчыне нарадзіўся папулярны пасля вайны ансамбль народных інструментаў пад кіраўніцтвам Мікалая Мікулы (пазней калектыў быў названы «Нёманцы»). Цікава, што іграць на скрыпцы Мікалая Мікулу навучыў бацька вядомага паэта Адама Русака Гарасім Іванавіч.

У 1950-ыя — пачатку 1960-ых гадоў на Капыльшчыне налічвалася больш за 70 духавых аркестраў (часам з двума саставамі).

Адкуль мы даведаліся пра ўсё гэта? З экспазіцыі ў музеі Капыльскай музычнай школы. Тут можна ўбачыць унікальныя музычныя інструменты: скрыпку 1725 года, беларускія цымбалы, зроб-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

леныя ў вёсцы Калюга ў канцы XIX — пачатку XX ст., басэтлю і скрыпку, на якіх ігралі «Нёманцы».

Але найбольшую цікавасць выклікае унікальная калекцыя дудак, родзічак таго паляўнічага рога, што ўпрыгожваў старажытны герб Капыля. Адну дудку — мадыфікаваную, з храматычным гукарадам — зрабіў адзін з лепшых выканаўцаў ці не самага папулярнага сёння на Капыльшчыне музычнага калектыву — «Капыльскіх дудароў» — А. Еўдакімаў. А цэлы набор розных па гучанню дудак — справа рук арганізатара тых самых «Капыльскіх дудароў» М. Астрэйкі. Думаецца, чытачам будзе цікава бліжэй пазнаёміцца з гісторыяй гэтай слыннай творчай суполкі.

У 1950-ыя гады ў Капыльскім раённым Доме культуры з'явіўся новы калектыў — аркестр народных інструментаў «Капыльскія музыкі». Арганізаваў яго Мікалай Астрэйка, на той час вядомы па ўсім наваколлі самабытны музыка. З дзяцінства ён слухаў і паўтараў мелодыі сваёй Бацькаўшчыны. Дасюль на Капыльшчыне можна пачуць легенды пра гэтага чалавека.

Кажуць, ідзе ён, ідзе па вёсцы, спыніцца, каб папіць вады, і не паспееш вокам міргнуць, а ў яго руках ужо дудачка. Цешыць душу, збірае да калодзежа ўсіх суседзяў палкая полечка.

Скончыць музыка мелодыю і дорыць дудачку каму-небудзь з прысутных. А сам дастае новую, яшчэ больш галасістую. Людзі толькі дзівіліся: дзе тыя дудкі месцяцца, у якіх патаемных сховах і кішэнях? Мікалай Астрэйка развітаўся і, абапіраючыся на посах, выходзіў на дарогу. Потым раптоўна паварочваўся, і ўсе бачылі, што ў руках яговых зусім не посах, а дудка. І ўсё наваколле зноў поўнілася музыкай.

Яшчэ ў 1930-ыя гады Мікалай Астрэйка зрабіў сапранавыя дудкі in C і in B, альтовыя in F, басовыя in F. У 1940 годзе яму выпала выступаць падчас Дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Праграма была настолькі насычаная, што арганізатары хацелі не выпускаць Мікалая Астрэйку на сцэну. Ды толькі той пакрыўдзіўся, пайшоў на прыём да самога Міхаіла Іванавіча Калініна — і сыграў з вялікай сцэны тое, што задумаў. Можа, тое выступленне і натхніла музыку сабраць вакол энтузіястаў і перадаць ім сваё майстэрства. Так яшчэ да вайны на Капыльшчыне з'явіўся першы секстэт дудароў.

Ужо з новым калектывам, з «Капыльскімі музыкамі», Мікалай Астрэйка ў 1951 г. выступаў на Усесаюзным аглядзе самадзейнасці, а ў 1956 г. — у Мінску на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета БССР. У 1960 годзе легендарны музыка перайшоў працаваць у аркестр І. Жыновіча. Але ансамбль дудароў не распаўся. Яго ўзначаліў Сяргей Рончык. Разам з дударамі зайгралі баяністы, цымбалісты. Усяго каля 30 чалавек. Гэта ўжо быў аркестр. І назва ў яго змянілася.

З 1984 года «Капыльскімі дударамі» кіруе Валянцін Матуз. У рэпертуары побач з народнымі мелодыямі з'явіліся творы сучасных беларускіх кампазітараў.

Калектыў шырыцца. І ўжо бывае цяжка сабрацца ўсім на рэпетыцыі. Удзельнікі «Капыльскіх дудароў» працуюць на розных капыльскіх прадпрыемствах: на заводзе гумава-тэхнічных вырабаў, у раённым аб'яднанні «Сельгастэхніка», у ПМК № 11 і № 1. Але В. Матуз знаходзіць магчымасць сустрэцца з кожным удзельнікам, цярпліва развучвае, часта дадаткова, аркестравыя партыі. І толькі пасля папярэдняй падрыхтоўкі праводзіць агульную рэпетыцыю.

Калі папытаць у саміх удзельнікаў, дзе лепш за ўсё іх слухаюць, яны наўрад ці запросяць у вялікую сталічную залу на гастролі. Скажуць: «Прыязджайце да нас у Капыль». Яны маюць рацыю. Землякі, што збіраюцца на іх выступленні ў Капыльскі раённы Дом культуры, — самыя шчырыя і патрабавальныя слухачы.

...Гучыць пранікլівая, кранальная мелодыя «Дудары» з «Палескай сюіты» Я. Глебава; нельга не заўважыць, як чыста вядзе яе квінтэт дудароў, як мякка, суладна акампануе яму аркестр.

«Песня дудароў» І. Кузняцова, напісаная ў 1960-ыя гады, дапамагла максімальна прадэманстраваць мастацкія магчымасці беларускага духавога інструмента. Твор вельмі вобразны. Спачатку павольна і шырока гучыць лірычнае сола ў выкананні А. Еўдакімава. І на памяць міжволі прыходзяць паэтычныя радкі Якуба Коласа:

Грае дудка, вымаўляе,
Плача дробнаю слязой
І ціхутка замірае
Дзесь у полі за гарой...

Але вось кантылену змяняе палкая хуткая беларуская полька. І ўжо хочацца згадаць верш «Капыльскія дудары» Адама Русака:

У Капылі на гары
Заігралі дудары.
Слухаў гранне дзед Лявон:
— Мне і старасць не закон.
Калі песня душу грэе,
Калі сэрца маладзее,
Дай жа тупну з весялосці,
Каб не нылі мае косці.
Ад «Капыльскіх дудароў»
Буду молад і здароў.

У аснову яшчэ аднаго вельмі папулярнага ў капыльскіх музыкаў твора І. Кузняцова «Найгрыш» пакладзены карагодныя мелодыі.

Хораша гучыць у інструментальным выкананні беларуская народная песня «Нёман». Быццам наяве бачыш, як струменіцца ў празрыстым паветры ранішняе святло, адчуваеш шырыню родных прастораў. Па-майстэрску вядзе сола А. Еўдакімаў, туруе яму дудар Алег Корзун.

Горача прымаюць слухачы «Беларускую фантазію» Э. Лямбовіча, «Груздоўскую польку», арыгінальны твор А. Скарабагатчанкі «На кірмашы». У апошнім творы кранаюць сэрца сола жалейкі, палкі «вясковы вальс».

— Рэпертуар на такі, як у нас, склад, — кажа сённяшні кіраўнік «Капыльскіх музыкаў» В. Матуз, — падабраць вельмі цяжка. Апрацоўкі часта даводзіцца рабіць самім. Калі кампазіцыя не падабаецца музыкантам або занадта цяжкая для выканання, мы за яе не бяромся. Многія беларускія кампазітары пішуць творы спецыяльна для нашага аркестра. Даўно супрацоўнічаем мы з І. Кузняцовым, Э. Лямбовічам, В. Войцікам. З вялікай радасцю разбіралі «Апашанскую польку» ў інструментоўцы Мікалая Сіраты, «Марш на беларускія тэмы» Э. Лямбовіча.

Кожны канцэрт «Капыльскіх дудароў» — гэта новая творчая перамога калектыву, у якім з вялікай пашанай ставяцца да музычнага фальклору. Выканаўчая культура, чысціня інтанацыі, каларыт гучання і аб'ём гуцці, пранікլівасць у кантылене робяць выступленні незабыўнымі.

«Капыльскія дудары» выступалі ў Уздзенскім, Стаўбцоўскім, Дзяржынскім, Нясвіжскім і іншых раёнах. Аркестр штогод летам дае канцэрты ў Мінску, удзельнічаў у святе горада «Мінск-86», у адкрыцці рэспубліканскай выстаўкі «Гармонія і асяроддзе» ў Палацы мастацтва, у фестывалі «Спяваючыя цымбалы» ў Віцебску, у Фестывалі дружбы ў г. Міронаўка Кіеўскай вобласці. Памятным было адно з нядаўніх выступленняў у г. Палессе перад удзельнікамі ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Але, вядома, з асаблівай увагай рыхтуюцца музыкі да выступленняў у сябе дома, на Капыльшчыне, зямлі з даўнімі, трывалымі музычнымі традыцыямі. У 1987 годзе аркестру «Капыльскія дудары» нададзена ганаровае званне народнага.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ